

КЛЯТВА НА ВЕРНАСЦЬ РАДЗІМЕ 5



МІСІЯ – ВЫХАВАННЕ І АСВЕТА 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ЛІСТАПАДА 2024 г. АЎТОРАК № 230 (30364)




**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка знаходзіцца ў Пакістане з афіцыйным візітам**

Асноўная ўвага падчас візіту будзе ўдзелена далейшаму пашырэнню ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з акцэнтам на практычныя крокі па развіцці гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння.

У Ісламабадзе Аляксандр Лукашэнка правядзе перагаворы з прэм'ер-міністрам Пакістана Шахбазам Шарыфам. Сустрэча пройдзе ў вузкім фармаце і пашыраным складзе з удзелам членаў дэлегацый. Бакі разгледзяць найбольш перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва і абмяркуюць сумесны план дзеянняў на перспектыву.

Асобная ўвага будзе ўдзелена тэме рэгіянальнай і глабальнай бяспекі, узаемадзеянню ў інтэграцыйных аб'яднаннях і сумеснай рабоце на міжнародных пляцоўках. Па выніках перагавораў будзе падпісаны пакет міжнародных дакументаў.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вадзім ГРАЧОЎ, намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:**

*«Сёння ў працоўных калектывах ахоп прафсаюзным рухам у сярэднім складае 93 %. Людзі вераць прафсаюзам, звяртаюцца ў прафсаюзы па абарону сваіх правоў і інтарэсаў, і мы дапамагаем. За апошнія 10 гадоў мы стварылі каля 8 тысяч новых пярвічных прафсаюзных арганізацый у калектывах прыватнай формы ўласнасці. Найважнейшай задачай прафсаюзаў была і будзе абарона інтарэсаў працоўных, іх сем'яў, а таксама паляпшэнне ўмоў жыцця і працы.*

# У паход па здароўе



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

У Тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Заводскага раёна сталіцы для людзей «сярэбранага» ўзросту створаны ўсе ўмовы не сумаваць і падтрымліваць сябе ў форме. У рамках клуба «Аматары здаровага ладу жыцця» аднадумцаў аб'ядноўваюць наведванне басейна, заняткі ёгай і скандынаўскай хадзьбой. У любую пару года ў Лошыцкім парку можна ўбачыць актыўных прыхільнікаў фізічнай культуры і спартыўнага адпачынку. Вольга Гілянкова, сужэнцы Людміла і Віктар Мамай, Алена Марчанка і псіхолаг аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Святлана Мурашова з задавальненнем разам праводзяць час за карыснымі практыкаваннямі на свежым паветры.

Спецыяльны рэпартаж

## СВЯТА СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ

Так ацанілі магілёўчане рэспубліканскую грамадска-культурную акцыю «Марафон адзінства», у рытме якой горад жыў два дні

**Тысячы гараджан сталі ўдзельнікамі мерапрыемстваў марафону. І шмат хто казаў, што энергетыка, якая панавала на пляцоўках, сапраўды была магутным яднальным сродкам. Людзі пераканаліся, што іх мэты і задачы супадаюць: жыць у міры, сумленна працаваць і гадаваць дзяцей. Магілёў атрымаў шмат падарункаў у выглядзе канцэртаў, сустрэч з вядомымі дзяржаўнымі дзеячамі, палітолагамі, артыстамі, кніг, якімі папоўнілася Магілёўская абласная бібліятэка. Было шмат сюрпрызаў, новых праектаў, арыгінальных ідэй. Гэта ўсё ўжо гісторыя. Якія ж засталіся ўражанні і ў чым карысць марафону? Пра гэта ў нашым рэпартажы.**

СТАР. 8—9

Да ведама

## НОВЫ ФАРМАТ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

**Універсальнае выданне цяпер выходзіць у электроннай версіі**

**Калі казаць пра перадгісторыю, то нам неабходна вярнуцца гадоў на сто назад — менавіта тады ў нас і пачалося развіццё энцыклапедычнай справы. А больш як год таму Старшыня Прэзідыума НАН беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ ініцыіраваў арганізаваць у Нацыянальнай акадэміі навук Цэнтр энцыклапедычных выданняў (ЦЭВ), задача якога — стварэнне мультымедыйных анлайн-рэсурсаў і рэдакцыйна-выдавецкая дзейнасць. Уласна, з гэтага пачалася вялікая і сур'ёзная работа па стварэнні электроннай версіі беларускай энцыклапедыі, узначаліў якую кіраўнік Нацыянальнай акадэміі навук. Зроблены і першыя сур'ёзныя крокі: распрацаваны і адкрыты для карыстальнікаў сайт «Беларуская энцыклапедыя», у якім напоўнены інфармацыяй два з дзесяці раздзелаў — «Беларусь у Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах» і «Прырода Беларусі».**

— Падрыхтоўка анлайн-версіі энцыклапедыі з'яўляецца непазбежным этапам развіцця і сёння практычна адзіным шляхам да чытача, — кажа **дырэктар Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі Станіслаў ЮРЭЦКІ.** — На сёння распрацаваны і адкрыты для карыстальнікаў сайт "Беларуская энцыклапедыя". Гэта, па сутнасці, шматтомная рэгіянальная краіназнаўчая энцыклапедыя міжнароднага ўзроўню, унікальны праект па аб'ёме інфармацыі, колькасці прыцягнутых спецыялістаў, магчымасцях для іх узаемадзеяння.

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцовы.



Міжнародны вектар

# Каб развівалася і пашыралася супрацоўніцтва

## Беларусь і Пакістан падрыхтавалі дарожную карту аб усебаковым супрацоўніцтве да 2027 года

**Аб гэтым паведаміў журналістам міністр энергетыкі, сустаршыня беларуска-пакістанскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве Аляксей Кушнарэнка на палях беларуска-пакістанскага бізнес-форуму ў Ісламабадзе. Форум праходзіў напярэдадні перагавораў на вышэйшым узроўні.**

**Аб тым, што бізнес-супрацоўніцтва дзвюх краін трэба пашыраць і ўзмацняць, гаварыў нядаўна і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які сёння знаходзіцца ў Пакістане з афіцыйным візітам. Тавараабарот паміж краінамі па выніках 2023 года склаў практычна 50 млн долараў. Прэзідэнт Беларусі лічыць, што гэта лічба не адпавядае існуючаму патэнцыялу. У жніўні на сустрэчы са спікерам Нацыянальнай асамблеі парламента Пакістана Сардарам Аязам Садзікам кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што бакі дамовіліся «аднавіць, прарэвізаваўшы, адносіны, вывесці іх на яшчэ больш высокі ўзровень, чым гэта было раней».**

**«Згадзіцеся, што тавараабарот паміж высокатэхналагічнай Беларуссю і такой краінай у 200 з лішнім мільёнаў чалавек, я сказаў бы, нават мізэр. Трэба паглыбляць і пашыраць па наменклатуры наш тавараабарот», — перакананы Аляксандр Лукашэнка.**

**Таму ў цяперашнім візіце кіраўніка нашай дзяржавы ў Ісламабад акцэнт робіцца на практычныя крокі па развіцці гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння. І адным з такіх важных крокаў сталі вынікі беларуска-пакістанскага бізнес-форуму.**

### Каласальны ўзаемны інтарэс па розных напрамках

На форуме прысутнічалі прадстаўнікі больш як 250 розных кампаній і прадпрыемстваў. Вынікам гэтай работы стала падпісанне камерцыйных кантрактаў і мемарандумаў. «Мы з задавальненнем канстатуем, што расце тавараабарот паміж нашымі краінамі. Ён ужо дасягнуў 34 млн долараў з ростам у 3,7 працэнта. Пры гэтым мы разумеем, што гэта далёка не мяжа, таму ў рамках візіту плануем падпісаць дарожную карту аб усебаковым супрацоўніцтве на перыяд да 2027 года», — расказаў Аляксей Кушнарэнка.

Гэты дакумент павінен надаць імпульс актывізацыі двухбаковага супрацоўніцтва. «Мы бачым каласальны ўзаемны інтарэс па розных кірунках. Гэта прамысловасць, сельская гаспадарка, сфера адукацыі, фармакалогія і іншыя. У абодвух бакоў ёсць кампетэнцыі, якімі яны гатовы дзяліцца», — дадаў Аляксей Кушнарэнка.

Гаворачы аб сумесным бізнес-форуме, ён падкрэсліў, што мерапрыемствы такога фармату з'яўляюцца эфектыўнай пляцоўкай для прамога дыялогу бізнес-колаў. Што датычыцца Беларусі і Пакістана, то добрыя камерцыйныя перспектывы адкрываюцца ў галіне прамысловай кааперацыі сельскай гаспадаркі, фармацэўтыкі, адукацыі, навукі і турызму. На пакістанскім рынку запатрабаваны беларуская сельскагаспадарчая тэхніка, прамысловая, нафтахімічная, малочная прадукцыя. У Беларусі ж карыстаюцца попытам тавары лёгкай прамысловасці з Пакістана і прадукты харчавання.

### Тэмпы росту экспарту ўражваюць

Беларускія прадпрыемствы на бізнес-форуме ў Пакістане дасягнулі дамоўленасцяў на 17 млн долараў, паведаміў журналістам старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Міхаіл Мятлікаў.

У рамках візіту кіраўніка беларускай дзяржавы ў Пакістан прыбыла вялікая бізнес-дэлегацыя з Беларусі — больш як 40 прадстаўнікоў айчынных прадпрыемстваў. «Ужо гатовы да падпісання восем дакументаў на агульную суму больш як 17 млн долараў. Але перагаворы будуць праходзіць два дні, таму, думаю, дадаткова будзе падпісаны яшчэ шэраг дакументаў і пратаколаў аб намерах», — адзначыў Міхаіл Мятлікаў.

Паводле яго слоў, бакі сышліся на думцы, што пакуль яшчэ мала ведаюць адзін аднаго. Так, некаторыя кірункі супрацоўніцтва з'яўляюцца ўжо традыцыйнымі, напрыклад, машынабудаванне, сельская гаспадарка, але неабходна выходзіць на новыя перспектывы. Мы ўжо дамовіліся, што бізнес-дэлегацыя з Пакістана прыедзе на нашу новую выставу «Мая Беларусь» (у студзені яна плануе наведаць нашу краіну), прыме ўдзел у «Белагра». І мы таксама разглядаем удзел нашых кампаній у шэрагу выставак, якія праходзяць на тэрыторыі Пакістана, каб пашырыць лінейку прадукцыі, што пастаўляем адзін аднаму», — расказаў старшыня БелГПП.

Міхаіл Мятлікаў дадаў, што ў 2023 годзе беларускі экспарт у Пакістан дадаў 250 працэнтаў у параўнанні з 2022 годам. Сёлета таксама адзначаецца рост: за паўгоддзе — плюс 130 працэнтаў да мінулагодняга паказчыка. І ўжо за гэты прамежак часу, за паўгода, экспарт склаў больш за $17 млн», — прывёў лічбы ён.

### Зборка тэхнікі і перапрацоўка вуглевадародаў

Беларускія прадпрыемствы плануюць наладзіць у Пакістане зборачныя вытворчасці сельскагаспадарчай і грузавой тэхнікі, расказаў Аляксей Кушнарэнка.

«Ёсць канкрэтныя намеры беларускіх вытворцаў наладжваць тут зборачныя вытворчасці сельскагаспадарчай і грузавой тэхнікі. Гэта могуць быць шматфункцыянальныя цэнтры, зборачныя вытворчасці. І мы адзначаем каласальную цікавасць пакістанскага боку ў гэтым напрамку. Думаю, у рамках форуму гэта пацвердзіцца канкрэтнымі кантрактамі і пагадненнямі, таму што ўжо цяпер ільвіную долю экспарту ў Пакістан якраз займаюць пастаўкі беларускай тэхнікі», — адзначыў Аляксей Кушнарэнка.

Па словах міністра, сярод канкурэнтаў Беларусі ў Пакістане — Кітай і суседнія дзяржавы. Але пры гэтым узровень кампетэнцый і развіцця прамысловасці, сельскай гаспадаркі дае магчымасць беларускім прадпрыемствам на роўных канкураваць з асноўнымі гульцамі на пакістанскім рынку.

У Беларусі таксама ёсць у Пакістане свае інтарэсы. Напрыклад, тут вельмі моцна развіта лёгкая прамысловасць. З Пакістана пастаўляецца садавіна. Сур'ёзна развіваецца фармакалогія. «Гэта таксама такія пункты росту, якія неабходна абмяркоўваць, за якія неабходна чапляцца і развіваць існуючы патэнцыял», — падкрэсліў Аляксей Кушнарэнка.

Міністр гандлю Пакістана, сустаршыня беларуска-пакістанскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве Джам Камал Хан на палях бізнес-форуму заявіў аб зацікаўленасці Пакістана ў супрацоўніцтве з Беларуссю ў сферы вуглевадароднай прамысловасці.

«У Пакістана таксама вялікі патэнцыял у вуглевадароднай прамысловасці. Некаторыя нашы кампаніі працуюць тут ужо 70 гадоў. А Беларусь мае значны тэхналагічны вопыт у выкарыстанні і перапрацоўцы вуглевадародаў. Мы хацелі б вывучыць гэтыя напрацоўкі для патрэб Пакістана. На дадзены момант гэтыя сферы ўяўляюць узаемны інтарэс для дзвюх краін», — сказаў Джам Камал Хан.

Ён адзначыў, што бакі ўжо даўно наладзілі цеснае ўзаемадзеянне ў машынабудаванні і сельскай гаспадарцы. Так, трактар «Беларус» карыстаецца ў Пакістане вельмі вялікай папулярнасцю яшчэ з савецкіх часоў.

«У той жа час мы стараемся даследаваць іншыя таварныя групы, асабліва ў плане скураных вырабаў, фармацэўтыкі. Ёсць вялікі патэнцыял з пункту гледжання росту ў сельскай гаспадарцы, павелічэння вытворчасці прадуктаў харчавання. У Беларусі нам цікавая вытворчая тэхніка, — сказаў міністр. — Так што, я думаю, ёсць шмат магчымасцяў для росту».

### Лагістыка — справа тонкая

Беларусь і Пакістан прапрацоўваюць арганізацыю «бясшвовай» грузавой лагістыкі, паведаміў журналістам генеральны дырэктар РУП «Белмытсэрвіс» Дзмітрый Кавалёнак на палях беларуска-пакістанскага бізнес-форуму.

Дзмітрый Кавалёнак адзначыў, што лагістыка паставак у Пакістан няпростая. Цяпер бакі працуюць над тым, каб прадпрыемствы маглі скараціць свае выдаткі на пастаўку тавараў у Пакістан і з Пакістана ў Беларусь.

«Калі мы наладзім правільныя партнёрскія адносіны, можам іх скараціць працэнтаў на 15. Трэба выпрацаваць агульныя транспартныя рашэнні для таго, каб у нас была бясшвовая лагістыка і грузы не прастойвалі ні ў Беларусі, ні ў порце Расійскай Федэрацыі, ні ў порце Пакістана», — распавёў генеральны дырэктар «Белмытсэрвіса».

Так, бакі падрыхтавалі праект міжурадавага пагаднення аб міжнародных аўтамабільных зносінах. У дакуменце вызначаюцца парадак ажыццяўлення міжнародных аўтамабільных перавозак пасажыраў і грузаў, умовы ўзаемнага вызвалення перавозчыкаў ад выплаты мытных пошлін, падаткаў і збораў, звязаных з выкарыстаннем транспартных сродкаў.

Рэалізацыя гэтага міжнароднага дагавора будзе садзейнічаць развіццю супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Пакістанам у галіне аўтамабільных перавозак, а таксама павелічэнню аб'ёмаў экспарту аўтатранспартных паслуг у напрамку Пакістана і сумежных краін.

**Паводле БелТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Дзяржаўны доўг ЗША абнавіў гістарычны максімум




Ён перавысіў адзнаку $36 трлн. Пра гэта паведаміла РІА «Новости» са спасылкай на Міністэрства фінансаў ЗША. Дзярждоўг Злучаных Штатаў, які яшчэ ў студзені складаў $34 трлн, за год вырас яшчэ на два трыльёны. Згодна з ацэнкай Міжнароднага валютнага фонду, узровень дзяржаўнага доўгу ЗША ў 2029 годзе дойдзе да адзнакі ў 131,7 працэнта ВУП, а да 2032-га суадносіны дзярждоўгу да ВУП ЗША перавысяць 140 працэнтаў. У фондзе папярэдзілі, што гэта пагражае як нацыянальнай, так і сусветнай эканоміцы. За час прэзідэнцтва Джо Байдэна дзярждоўг ЗША павялічыўся з $28 трлн у 2021 годзе да цяперашняга ўзроўню ў $36 трлн.

### На прэзідэнцкіх выбарах ва Уругваі перамог Яманду Орсі




У другім туры прэзідэнцкіх выбараў ва Уругваі перамогу атрымаў Яманду Орсі, які прадстаўляе апазіцыйную левацэнтрысцкую кааліцыю «Шырокі фронт». Аб гэтым паведаміла ТАСС. Орсі набраў 49 працэнтаў галасоў. Яго апанент Альвара Дэльгада з кіруючай правацэнтрысцкай Нацыянальнай партыі атрымаў 46 працэнтаў і прызнаў сваё паражэнне. З перамогай Орсі таксама павіншаваў дзейны прэзідэнт Уругвая Луіс Лакалле Поў. Орсі, які займаў пасаду мэра дэпартамента Канеланес у 2015—2024 гадах, называе адным са сваіх прыярытэтаў барацьбу са злачыннасцю, узровень якой ва Уругваі вырас у апошнія гады, а таксама з транзітам наркотыкаў праз тэрыторыю краіны. Палітык, які падтрымліваецца экс-прэзідэнтам Уругвая Хасэ Мухікай, таксама абяцае стварыць новыя працоўныя месцы і павысіць заробкі работнікаў з нізкімі даходамі. Орсі ўступіць на пасаду 1 сакавіка 2025 года.

### У Іраку ўпершыню за 37 гадоў правялі перапіс насельніцтва



Колькасць насельніцтва Ірака, паводле даных усеагульнага перапісу, праведзенага ў краіне ўпершыню за 37 гадоў, складае 45,4 мільёна чалавек. Пра гэта аб'явіў падчас спецыяльнай прэс-канферэнцыі кіраўнік іракскага кабміна Мухамед ас-Судані, паведаміла ТАСС. Прэм'ер адзначыў, што 50,1 працэнта насельніцтва складаюць мужчыны, а 49,8 працэнта — жанчыны. Доля непрацаздольнага насельніцтва, малодшага за 15 гадоў, складае 36,1 %, а людзей, старэйшых за 65 гадоў, — 3,7 % ад усяго насельніцтва Ірака, адзначыў Мухамед ас-Судані. Паводле вынікаў перапісу 1987 года, у Іраку пражывала 16,3 мільёна чалавек, а перапіс 1997 года, які не ўключаў у сябе раёны курдскай аўтаноміі, зафіксаваў рост насельніцтва да 22 млн.

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Палаты прадстаўнікоў шостага склікання Івана Аляксеевіча КАРЖА і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання Івана Аляксеевіча КАРЖА ў сувязі з яго смерцю.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім Дзмітрыя Аляксандравіча КРАТА, галоўнага рэдактара «Народнай газеты» ўстановы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Выдавецкі дом «Беларусь сегодня», у сувязі з яго смерцю.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім, а таксама калектыву «Народнай газеты» Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» ў сувязі са смерцю Дзмітрыя Аляксандравіча КРАТА, галоўнага рэдактара «Народнай газеты» Выдавецкага дома «Беларусь сегодня».**

**Выдавецкі дом «Звязда» выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім, а таксама калектыву «Народнай газеты» Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» ў сувязі са смерцю Дзмітрыя Аляксандравіча КРАТА, галоўнага рэдактара «Народнай газеты» Выдавецкага дома «Беларусь сегодня».**

Тры пытанні да ўлады

# КУТОК З ЯБЛЫЧНЫМ СМАКАМ

**Шаркаўшчына, што ў Віцебскай вобласці, — адзін з тых рэгіёнаў, дзе адначасова можна адчуваць сябе і гарадскім жыхаром, і быць у яднанні з унікальнай некранутай прыродай. А яшчэ — паспяхова развіваць прыватны бізнес з дапамогай раённых улад. Аб тым, чым прываблівае інвестараў і турыстаў раён, расказаў старшыня Шаркаўшчынскага райвыканкама Дзмітрый ЛАМАКА.**



***— Дзмітрый Міхайлавіч, за высокія паказчыкі, дасягнутыя ў ходзе правядзення ў 2023 годзе рэспубліканскага агляду санітарнага стану і добраўпарадкавання населеных пунктаў Беларусі, Шаркаўшчына прызнана пераможцам у IV катэгорыі. Дзякуючы чаму ўдалося дасягнуць такіх высокіх паказчыкаў? Якія новыя і абноўленыя аб'екты з'явіліся ў раёне ў 2024 годзе?***

— Дасягнуць высокіх паказчыкаў па добраўпарадкаванні ўдалося дзякуючы правядзенню абласнога фестываль-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2023» у Шаркаўшчыне і Шаркаўшчынскім раёне. Была праведзена вялікая работа з мэтай павышэння якасці жыцця нашага насельніцтва. Так, летась у гарпасёлку быў уведзены ў эксплуатацыю шматкватэрны жылы дом, 40 сем'яў атрымалі арэнднае жыллё. Капітальны рамонт закрануў 10 шматкватэрных дамоў, бягучы — 20 дамоў і адзін інтэрнат. Новы выгляд набылі 27 прыдамавых тэрыторый шматкватэрных жылых дамоў, людзі самі аказалі вялікую дапамогу адказным службам у добраўпарадкаванні.

У Шаркаўшчыне ў мінулым годзе з'явілася асфальтаваная пешаходная дарожка ўздоўж вуліцы Чырвонаармейскай, там жа ўсталявалі турыстычную карту раёна і банеры з інфармацыяй аб славутых земляках. Быў праведзены бягучы рамонт трох скверaў, усталяваны малыя архітэктурныя формы, адноўлены фантан. З мэтай стварэння сучаснага адукацыйнага асяроддзя капітальны рамонт з мадэрнізацыяй быў праведзены ў сярэдняй школе № 1 — ва ўстанове адукацыі былі абноўлены кабінеты і школьныя рэкрэацыі. Канешне, значная работа зроблена па ўдасканаленні дарожнай інфраструктуры: адрамантавана 48 вуліц пасёлка, усталявана пяць аўтобусных павільёнаў, адрамантаваны тратуары, на ўездзе ў пасёлак з боку Глыбокага з'явілася новая ўязная стэла, заменена больш чым 1400 вулічных ліхтароў. У кастрычніку 2023 года ўвялі ў эксплуатацыю новую шматпаліўную аўтазаправачную станцыю з аб'ектам грамадскага харчавання.

Работа па павышэнні камфорту жыцця людзей працягваецца і ў бягучым годзе. У маі пасля капітальнага рамонту быў уведзены ў эксплуатацыю мост праз раку Янку, праведзены капітальны рамонт аднаго шматкватэрнага жылога дома, добраўпарадкаваны тры прыдамавыя тэрыторыі. У снежні 2024 года пачнецца капітальны рамонт моста па вуліцы Савецкай, распрацоўваецца праектная дакументацыя па аб'екце будаўніцтва 40-кватэрнага жылога дома, які плануем увесці ў эксплуатацыю ў 2025 годзе. У жніўні бягучага года пасля мадэрнізацыі была адкрыта спартыўная пляцоўка ў сярэдняй школе № 1. У маі ў вёсцы Александрова быў адкрыты новы жылы корпус на 105 месцаў Александроўскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў. У найбліжэйшай перспектыве — будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплексу ў Шаркаўшчыне, гэта яшчэ адзін крок насустрач таму, каб зрабіць жыццё ў гарадскім пасёлку больш прывабным і камфортным.

***— У раёне праводзіцца актыўная работа па ўцягненні ў гаспадарчы абарот дзяржмаёмасці, што не выкарыстоўваецца. Раскажыце пра найбольш паспяховыя праекты, якія робяць унёсак у развіццё эканомікі раёна?***

— Уцягненне ў гаспадарчы абарот дзяржаўнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца і неэфектыўна выкарыстоўваецца, — адзін з прыярытэтных кірункаў работы райвыканкама сумесна з раённым Саветам дэпутатаў. Мы ўпэўнены, што наладзіць новую справу пад старым дахам больш эфектыўна, чым ліквідаваць будынак, — гэта і развіццё эканомікі рэгіёна, і, самае галоўнае, новыя працоўныя месцы, што для жыхароў сельскай мясцовасці асабліва актуальна.

Да ліку паспяховых праектаў, рэалізаваных у бягучай пяцігодцы, можна аднесці стварэнне швейнай вытворчасці на базе былой школы ў аграгарадку Навaселле таварыствам з абмежаванай адказнасцю «ХІТЧ». Летась ТАА «Шарлет» на пляцоўцы былога ваенкамата таксама адкрыла швейную вытворчасць, было створана чатыры працоўныя месцы. Яшчэ адно швейнае прадпрыемства з'явілася сёлета на невыкарыстоўвальных плошчах участка бытавых паслуг ЖКГ Шаркаўшчынскага раёна, створана сем новых працоўных месцаў.

У сферы турызму і адпачынку ў бягучым годзе пачалася рэалізацыя праекта ААТ «Спецсэрвіспрадукт» па стварэнні шматфункцыянальнага комплексу, які ўключае арганізацыю адпачынку. З гэтай мэтай прадпрыемствам з аўкцыёну набыты ва ўласнасць будынак хірургіі-гінекалогіі і будынак тэрапіі. Інвестар вядзе работы па рэканструкцыі набытых аб'ектаў. Тэрмін рэалізацыі праекта — 2024—2026 гады, плануецца стварыць аграсядзібу з пакоямі адпачынку і банкетнай залай, арганізаваць 10 працоўных месцаў.

Вядзецца работа па ўцягненні ў гаспадарчы абарот невыкарыстоўвальнай маёмасці ўсіх формаў уласнасці, актыўна рэалізоўваюцца праекты на плошчах спажывецкай кааперацыі. Так, у рамках ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект» таварыства з абмежаванай адказнасцю «Арганічныя прадукты» рэалізоўвае інвестыцыйны праект па вытворчасці сокаў і нектараў. Інвестар набыў былое бульбасховішча і прылеглы да яго комплекс будынкаў кансервавага завода, закуплена абсталяванне, актыўна вядуцца будаўніча-мантажныя работы.

***— У 2024 годзе ў Шаркаўшчыне быў адкрыты турыстычны інфармацыйны цэнтр. Якімі брэндавымі мерапрыемствамі і прыроднымі аб'ектамі можа зацікавіць турыстаў рэгіён?***

— Жамчужына Паазер'я — Шаркаўшчынскі раён — уваходзіць у падпраграму 4 «Развіццё сферы турызму і ўдасканаленне турыстычнай інфраструктуры ў Паазер'і Віцебскай вобласці на 2023—2025 гады» Дзяржаўнай праграмы «Беларусь гасцінная» на 2021—2025 гады. Таксама Шаркаўшчынскі раён уключаны ў рэалізацыю пілотнага праекта «Валошкавы край — 2». І нам ёсць чым зацікавіць гасцей, бо на тэрыторыі раёна размешчаны 11 азёр, тры заказнікі рэспубліканскага і 36 заказнікаў абласнога і мясцовага значэння, больш як 70 помнікаў прыроды. Для папулярызацыі экалагічнага турызму створаны інтэрактыўны экаклас-цэнтр і экалагічная сцежка «Прырода роднага краю».

У Шаркаўшчынскага раёна багатая гістарычная і культурная спадчына: да нашых дзён захавалася больш чым 10 храмаў, чатыры старажытныя паркі XVIII—XIX стагоддзяў, чатыры сядзібныя комплексы, 37 ваенна-гістарычных помнікаў. Пазнаёміцца асабіста і нават дакрануцца да гісторыі раёна можна ў мастацка-этнаграфічным музеі імя Язэпа Драздовіча і мемарыяльным музеі садавода-селекцыянера Івана Сікоры. Дарэчы, менавіта яблык з'яўляецца турыстычным брэндам рэгіёна, які быў распрацаваны дзесяць гадоў таму.

Падзейны і гастранамічны турызм прадстаўлены інтэрактыўнымі тэматычнымі фестывалямі, такімі як «Яблычны Спас», «Бульбяны фэст», «І ў клёцак ёсць душа!». Дарэчы, клёцкі «з душамі» ў 2017 годзе былі занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Упершыню ў верасні 2024 года ў Шаркаўшчыне прайшоў фестываль «Паазерскі кірмаш», які сабраў у гарпасёлку прадстаўнікоў раёнаў беларускага Паазер'я. На 2025 год наш фестываль ужо заяўлены ў календары падзейных мерапрыемстваў, што праводзяцца на тэрыторыі краіны.

Прыязджайце да нас, Шаркаўшчына гасцінная адкрытая для ўсіх!

***— Дзякуй за размову.***

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**



**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігар СЕРГЯЕНКА правядзе 29 лістапада асабісты прыём грамадзян у Шаркаўшчынскім раённым выканаўчым камітэце. Пачатак прыёму — 10.30. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў.**

Надвор'е

# ХУТКАЯ ЗІМА АДМЯНЯЕЦЦА

## Снег, які выпаў, растане, а новага пакуль не відаць



**Як паведамілі спецыялісты ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, на гэтым тыдні стане крыху цяплей, пойдуць дажджы, якія змыюць увесь снег.**

Сіноптыкі адзначаюць, што ў выхадныя на ўсходзе краіны назіраліся зімовыя пейзажы. У ранішнія гадзіны суботы месцамі гурбы выраслі да 15 сантыметраў, на метэастанцыі Касцюковічы вышыня белага покрыва дасягала 22 сантыметраў. Але цёплае паветра Атлантыкі «з'есць» усю гэтую прыгажосць без следу...

У аўторак надвор'е ў Беларусі ў асноўным будзе вызначаць воблaсць павышанага атмасфернага ціску. Чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай месцамі прагназуецца слабы туман і галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўднёвы, паўднёва-ўсходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, па паўднёвым усходзе краіны да 6 марозу, а максімальная днём будзе ад мінус 1 градуса па ўсходзе да 8 цяпла па паўднёвым захадзе. Атмасферны ціск будзе слаба падаць.

У сераду на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах могуць быць слабыя туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ўсталюецца ў межах ад мінус 4 градусаў да плюс 3, па паўднёвым усходзе — да мінус 8 градусаў. Максімальная тэмпература днём чакаецца ад мінус 2 градусаў па паўднёвым усходзе да 6 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

У чацвер ноччу месцамі па краіне, а днём на большай частцы тэрыторыі Беларусі чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах прагназуюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла, а максімальная днём — мінус 1 — плюс 5 градусаў.

У апошні дзень працоўнага тыдня ноччу на большай частцы тэрыторыі, а днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу, па паўднёвым захадзе — з дажджом. У асобных раёнах могуць быць слабыя туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — мінус 3 — плюс 3 градусы, а максімальная днём складзе ад мінус 1 градуса да 5 цяпла.

Паводле папярэдніх звестак айчынных сіноптыкаў, у гэтыя выхадныя з ростам атмасфернага ціску ападкі паступова спыняцца. Праўда, стане трохі халадней. У апошні дзень лістапада (у суботу) ноччу ў асобных раёнах краіны пройдзе невялікі кароткачасовы снег, мокры снег, днём пераважна без ападкаў. Месцамі чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла, а максімальная днём — ад 2 марозу да 3 градусаў вышэй за нуль.

А ў першы дзень зімы будзе наогул без ападкаў. У асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ўжо сапраўды зімовая — ад нуля да мінус 5, пры праясненнях да мінус 8 градусаў. А вось днём будзе хлюпота — ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Боегатоўнасць

# АКЦЭНТ — НА ВОПЫТ І НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ

**Падрабязнасці аператыўнага збору каманднага саставу Узброеных Сіл, які адбыўся на базе 30-й асобнай чыгуначнай брыгады**

**Удзел у рабоце аператыўнага збору ўзялі міністр абароны Віктар ХРЭНІН, начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Павел МУРАВЕЙКА, а таксама кіраўнікі органаў ваеннага кіравання, камандзіры і начальнікі штабоў злучэнняў і воінскіх часцей, іншыя службовыя асобы.**



## НАВІНКІ, ЗАПАТРАБАВАНЫЯ ЧАСАМ

У рамках першага — практычнага — этапа збору з яго ўдзельнікамі праводзіліся заняткі на некалькіх навучальных пунктах. На адной з лакацый быў арганізаваны паказ узбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі розных родаў войскаў і спецыяльных войскаў. Асаблівая ўвага была ўдзелена ўзорам БЛА, якія знаходзяцца на ўзбраенні воінскіх часцей, а таксама сродкам радыёэлектроннай барацьбы. Шэраг узораў узбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі прадставілі прадпрыемствы Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта.

Кіраўнік ваеннага ведамства наведаў навучальныя пункты, а таксама азнаёміўся з прадстаўленымі ўзбраеннем і тэхнікай. Раней міністр абароны паставіў задачу распрацаваць камплект гарнітуры для вайскоўца. Ён быў прадстаўлены ў межах збору. Навушнікі актыўныя — з абаронай слыху. Гарнітура, здольная адначасова працаваць у двух радыёсетках, мае магчымасць падключэння дэтэктара дронаў. Рэзюмэ міністра абароны: «Трэба дапрацоўваць». Вайсковыя выпрабаванні — у снежні. Генерал-лейтэнанту Віктару Хрэніну паказалі і турэль для знішчэння БЛА, бранятэхніку з рознымі відамі антыдронавай абароны. Як паказаў досвед СВА, любая дадатковая абарона павялічвае жывучасць бранятэхнікі і ў першую чаргу — асабістага складу.

Акрамя таго, на выставе былі прадстаўлены і актуальныя распрацоўкі БЛА, і комплексаў супрацьдзеяння ім, сродкаў сувязі і аўтаматызаванага кіравання войскамі, стралковай зброі і боепрыпасаў, сродкаў разведкі, радыёлакацыі і РЭБ, створаных спецыялістамі айчыннага ВПК.

На наступным навучальным месцы ўдзельнікам збору быў паказаны базавы раён аднаўлення баяздольнасці падраздзяленняў брыгады пасля прыбыцця з лініі баявога судакранання з сапернікам.

**Першы намеснік начальніка тылу Узброеных Сіл — начальнік штаба тылу Аляксандр МАСАЛОЎ** адзначыў, што гэты раён размяшчэння асабовага складу выкарыстоўваецца без палатачнага фонду. «У аснову гэта бліндажы, зямлянкі з усімі відамі тылавога забеспячэння, — удакладніў ён. — Тут размешчаны харчовы склад, арганізавана харчаванне ваеннаслужачых. Таксама тут выпякаецца хлеб. Стварэнне спрыяльных умоў для асабовага складу — залог паспяховага выканання задач».

На вучэбным палігоне Лесішча ўдзельнікі аператыўнага збору назіралі за дзеяннямі ваеннаслужачых у ходзе баявога эпізоду прымянення падраздзяленняў транспартных войскаў у мэтах забеспячэння выканання імі задач.



## АДАПТАЦЫЯ ДА НОВЫХ ВЫКЛІКАЎ

У завяршэнне першага дня аператыўнага збору міністр абароны ў размове з журналістамі падвёў вынікі адыходзячага навучальнага перыяду і абазначыў планы на будучыню. Кіраўнік абароннага ведамства адзначыў, што міжнародныя адносіны характарызуюцца напружанасцю, а таму ваенная сіла стала набываць вялікае значэнне ў вырашэнні міждзяржаўных супярэчнасцей.

Ваеннаслужачыя Узброеных Сіл, па словах міністра абароны, адэкватна рэагуюць на напружанасць каля нашых граніц. «Бескантрольная мілітарызацыя нашых суседзяў, агрэсіўная рыторыка, нежаданне кіраўніцтва суседніх з намі дзяржаў знаходзіць кропкі судакранання, канфлікт ва Украіне — усё гэта адбіваецца на ваеннай бяспецы нашай дзяржавы, — канкрэтызаваў Віктар Хрэнін. — У такіх умовах мы ўдакладнялі свае планы падрыхтоўкі. Гэтая нагрузка адбівалася і на органах кіравання, і на вайсковых падраздзяленнях, асабліва на падраздзяленнях ССА і войскаў СПА. І ў рамках адэкватнага рэагавання мы абавязаны выконваць свае задачы, павялічваць баяздольнасць нашых Узброеных Сіл».

Напрыклад, працягваецца паставка новых і перспектыўных узораў узбраення і ваеннай тэхнікі ва Узброеныя Сілы. Сёлета на ўзбраенне прынята звыш 60 розных узораў. Захавалася масавасць мерапрыемстваў аператыўнай і баявой падрыхтоўкі ў выглядзе розных вучэнняў, камандна-штабных трэніровак, раптоўных праверак.

«У баявой падрыхтоўцы асноўную ўвагу мы засяродзілі на аваладанні новымі тактычнымі прыёмамі, заснаванымі перш за ўсё на аналізе сучасных узброеных канфліктаў, у тым ліку і СВА, — паведаміў міністр абароны. — Яны актыўна ўкараняюцца ў практыку баявой падрыхтоўкі нашых Узброеных Сіл. У аснове — здзяйсненне камбінаваных маршаў на вялікія адлегласці, стварэнне адпаведных груповак на неабходных напрамках. Гэта і пытанні агнявой вывучкі асабовага складу, у тым ліку перапрацоўка дакументаў, якія рэгулююць гэтыя пытанні».

Кіраўнік ваеннага ведамства адзначыў, што ў новым навучальным годзе будзе зацверджаны новы курс стрэльбаў. «Ён больш адаптаваны да баявых рэалій, — удакладніў генерал-лейтэнант. — Пытанні абароны, процідзеяння БЛА, радыёэлектроннай барацьбы, тактычнай медыцыны, радыёлакацыйнага абсталявання цяпер у прыярытэце. Як патрабуе наш Галоўнакамандуючы, менш муштры».

## «ЗАДАЧА АДНА — МІРНАЕ НЕБА»

Таксама сур'ёзную ўвагу ваеннае ведамства сёлета ўдзяляла аператыўнаму абсталяванню тэрыторыі. Працягваецца абсталяванне ўмацаваных раёнаў, якія сталі не проста аб'ектамі, але і месцам правядзення падрыхтоўкі нашых ваеннаслужачых.

«Мной у мінулым годзе быў зацверджаны інстытут інструктараў, якія на працягу гэтага года актыўна ўдзельнічалі ў працэсе падрыхтоўкі ваеннаслужачых у рамках баявой падрыхтоўкі, — паведаміў Віктар Хрэнін. — Каля 150 чалавек прайшлі падрыхтоўку ў Расійскай Федэрацыі. Мы працягнулі падрыхтоўку і ў сумесных навучальна-баявых цэнтрах Беларусі і Расіі».

Асаблівыя намаганні засяроджаны на падрыхтоўцы аператараў БЛА. «Тут мы таксама рухаемся наперад, разумеючы, што тыя сістэмы ўжывання і дужання з БЛА, якія ў нас ёсць, усё роўна падвяргаюцца сталаму ўдакладненню, змяненню, — патлумачыў міністр абароны. — Мы разумеем, што неабходна мець большую колькасць аператараў. Ужо ўкаранёна падрыхтоўка аператараў на ўзроўні ДТСААФ. Адкрываем спецыялізаваныя класы ў навучальных установах, дзе ёсць ваенныя кафедры, ваенныя факультэты. З новага навучальнага года на базе Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь будзе працаваць новая спецыялізаваная кафедра баявога прымянення БЛА, на якой усе курсанты незалежна ад спецыяльнасці атрымаюць адпаведную падрыхтоўку. І ў гэтым кірунку мы не збіраемся спыняцца. Мы разумеем, што на сённяшні дзень БЛА — важны і вельмі перспектыўны сродак узброенай барацьбы».

Рэзюмуючы, кіраўнік абароннага ведамства адзначыў, што вучэнні, праверкі, кантрольныя заняткі, якія праходзілі на працягу года, паказалі, што органы ваеннага кіравання гатовы і здольны кіраваць войскамі, а войскі гатовы да выканання задач па прызначэнні. «Задача ў нас адна — забяспечыць мірнае неба ў нашай краіне, — падкрэсліў Віктар Хрэнін. — Гэтага ад нас патрабуе наш Прэзідэнт. І гэтага чакае ад нас наш народ».

Новы навучальны год ва Узброеных Сілах аб'яўлены Годам воінскага майстэрства. Плануецца, што беларускія ваеннаслужачыя возьмуць удзел ва ўсіх маючых адбыцца вучэннях, трэніроўках, якія будуць праходзіць на тэрыторыі краін АДКБ. Галоўным мерапрыемствам падрыхтоўкі ў наступным годзе стане сумеснае стратэгічнае вучэнне Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі «Захад-2025». Акрамя таго, будзе праведзены комплекс мерапрыемстваў у адпаведнасці з планам падрыхтоўкі, раптоўных праверак.

У завяршэнне аператыўнага збору прайшло пасяджэнне калегіі Міністэрства абароны, на якім былі падведзены вынікі падрыхтоўкі Узброеных Сіл у 2023/2024 навучальным годзе, а таксама пастаўлены задачы на наступны навучальны год. Міністр абароны заахвоціў асобных камандзіраў і начальнікаў. Шэрагу афіцэрам датэрмінова прысвоены воінскія званні за значны ўклад у абараназдольнасць краіны і высокія вынікі ў баявой падрыхтоўцы.

**Алег НЯКАЛА,**
**фота аўтара.**

Экскурсія

# У ПАЛАЦ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ ЗАВІТАЛІ НАЙЛЕПШЫЯ КАМАНДЗІРЫ УЗБРОЕНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ

**Гэтым разам у Палацы Незалежнасці правялі экскурсію для камандзіраў злучэнняў і воінскіх часцей, якія дасягнулі найлепшых вынікаў у службовай дзейнасці ў 2023/2024 навучальным годзе. Яны прыехалі разам са сваімі жонкамі з усіх куткоў Беларусі, каб наведаць знакавую для кожнага беларуса пляцоўку.**

Пачалася экскурсія ў самай вялікай у краіне зале ўрачыстых цырымоній. Гэтая пляцоўка прымае шмат важнейшых, сімвалічных, статусных мерапрыемстваў. Сваімі ўражаннямі ад наведвання падзяліўся **камандзір 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння палкоўнік Дзмітрый БЫКОНЯ**:

— У Палацы Незалежнасці знаходжуся першы раз, — расказаў ён. — Яго аб'ём велізарны, манументальны. Хваляюча ад таго, што менавіта тут працуе кіраўнік нашай дзяржавы.

На пытанне журналістаў аб тым, ці ёсць за што з пункту гледжання бяспекі перажываць сёння беларусам, Дзмітрый Леанідавіч адказаў так:

— Упэўнены, усе вайскоўцы мяне падтрымаюць, беларусам сёння перажываць няма за што, — запэўніў ён. — Усе падраздзяленні краіны складаюцца з падрыхтаваных вайскоўцаў. Кіраўнік дзяржавы не раз падкрэсліваў, што, калі Узброеныя Сілы моцныя, дзяржава знаходзіцца пад надзейнай абаронай.

Акрамя залы ўрачыстых цырымоній ганаровыя госці прайшліся па тых залах Палаца Незалежнасці, дзе прымаюцца не менш значныя рашэнні, пішацца сучасная гісторыя нашай краіны, праходзяць міжнародныя сустрэчы.

Кожная з іх прываблівае сваёй асаблівай атмасферай, якая ўражвае. Асабліва тых, хто наведвае Палац упершыню. Адзін з такіх гасцей — **маёр 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Андрэй РУБІН**:





— Я ганаруся, што знаходжуся сёння тут, у знакавым месцы, дзе кіраўнік дзяржавы прымае найважнейшыя рашэнні і робіць усё для таго, каб краіна развівалася і кожны грамадзянін адчуваў сябе тут камфортна.

Ён таксама расказаў аб выніках работы батальёна за мінулы навучальны год:

— Год быў насычаны мерапрыемствамі. Асноўныя намаганні былі накіраваны на расследаванне генацыду беларускага насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мы зрабілі важны ўнёсак у нашу гістарычную памяць, — адзначыў ён.

Правядзенне такога мерапрыемства ў Палацы Незалежнасці — гэта знак удзячнасці тым, хто сваім воінскім прафесіяналізмам і выдатнымі вынікамі ў баявой вучобе забяспечвае ваенную бяспеку Беларусі і мірнае жыццё яе грамадзян.

Магчымасць наведаць пляцоўку таксама прадаставілася **падпалкоўніку 49-й радыётэхнічнай брыгады Аляксею ЯНЮКУ**. Ён адзначыў велічнасць і ганаровасць Палаца Незалежнасці, а таксама падзякаваў жонцы, якая суправаджала яго не толькі на экскурсіі, але і працягвае гэта рабіць у паўсядзённым жыцці.

**Яна ВАЛАСАЧ,**
**фота аўтара.**

Бяспека Айчыны

# СВЯТЫ АБАВЯЗАК

## Ваеннаслужачыя новага папаўнення прынялі Ваенную прысягу

**23 лістапада ў розных кутках краіны адбыліся ўрачыстыя цырымоніі прыняцця Ваеннай прысягі. Толькі на пляцы 72-га гвардзейскага аб'яднанага навучальнага цэнтра больш за дзве тысячы чалавек пакляліся быць вернымі свайму народу, мужна і самааддана абараняць незалежнасць, тэрытарыяльную цэласнасць і канстытуцыйны лад нашай краіны. Па добрай традыцыі маладых людзей у гэты дзень прыйшлі падтрымаць самыя дарагія людзі. Міністр абароны Беларусі таксама павіншаваў навабранцаў. Карэспандэнты «Звязды» адправіліся ў Барысаўскі раён і далучыліся да свяшчэннага воінскага рытуалу.**

**З гэтага дня для ваеннаслужачых новага папаўнення афіцыйна пачынаецца служба ва Узброеных Сілах. За плячыма — курс маладога байца! Наперадзе — насычаны час, калі трэба будзе не толькі асвоіць ваенную справу, але і навучыцца дзейнічаць у камандзе.**



### ПАДТРЫМКА АД САМЫХ БЛІЗКІХ

Сярод тых, хто даў клятву на вернасць сваёй Радзіме, — ваеннаслужачы Яўген Ласіцкі са Слоніма. «Мне падабаецца служыць. Тут прыемны калектыў, добрыя сяржанты і афіцэры, якія заўсёды падтрымаюць у цяжкую хвіліну, — расказаў малады чалавек. — Дзякуючы тэрміновай службе я стаў больш шанаваць сяброў і родных. За мінулы месяц мы не адзін раз выязджалі на стрэльбішча. Эмоцыі зашкальваюць, перакананы, што паспрабаваць патрымаць сапраўдную зброю ў руках павінен кожны. У хуткім часе чакаецца і абкатка БМП».

Цяга да службы ў маладога чалавека з сям'і. «Мой дзед і дзядзька таксама ў свой час звязалі жыцці са служэннем Айчыне, — адзначыў Яўген Ласіцкі. — Яшчэ ў школе навучыўся маршыраваць. Разам з аднакласнікамі неслі Ганаровую Вахту Памяці на плошчы Перамогі ў Мінску».

Каб падтрымаць Яўгена, у воінскую часць прыехалі самыя блізкія людзі — бацька і маці. Яны ганарацца сынам і таксама не могуць стрымаць эмоцыі. «Калі адпраўляеш сына ў армію, адчуваеш цудоўныя эмоцыі, таму што разумееш: пачнецца новы жыццёвы этап, — распавяла маці ваеннаслужачага Аксана. — Мы памятаем, як плакалі, калі аддавалі яго ў садок ці ў школу. Але ў гэтым выпадку ўсё зусім інакш. Тут я ўжо выразна



і свядома разумею, што аддаю сына ў дарослае жыццё, дзе раскрыецца мужнасць, з'явіцца адказнасць, а тое, што закапана ў глыбіні душы, стане выяўляцца больш актыўна. Дзякуючы арміі хлопцы пачнуць шанаваць многія рэчы, разумець, што ў жыцці не ўсё даецца так проста. Тэрміновую службу павінен прайсці кожны мужчына, бо яна робіць чалавека больш усвядомленым, мужным, вучыць шанаваць кожныя дробязі».



Сёння маці ваеннаслужачага адчувае асаблівае трапятанне: «Да сына прыехалі вялікім саставам. Не толькі сваякі, але і сябры. А гэта асабліва важна. Я вельмі хвалююся, але паабяцала сабе, што буду трымацца стойка».

Па словах Васіля, бацькі ваеннаслужачага, сын кардынальна змяніўся: «Мы вельмі рэдка маем зносіны, ні разу яшчэ не бачыліся за гэты час, але па голасе, па гутарцы і паводзінах ён ужо паспелеў. Многае яшчэ наперадзе. Мы вельмі ім ганарымся!»

### ЯНА АДКАЗАЛА «ТАК!»

На Ваеннай прысязе «нараджаюцца» не толькі салдаты Беларусі, але і новыя сем'і. Тады ў Барысаўскім мікрараёне Печы на вачах больш чым двухтысячнага саставу адзін з навабранцаў 72 АНЦ зрабіў прапанову сваёй каханай. І яна адказала «Так!». Гэты кранальны момант падарыў масу станоўчых эмоцый перад афіцыйнай часткай.

Пакуль ішлі апошнія падрыхтоўкі да ўрачыстага рытуалу, ваеннаслужачы Ягор Рамановіч зрабіў прапанову сваёй дзяўчыне Лізавеце. Малады чалавек схіліў калена, працягнуў пярсцёнак і спытаў у каханай: «Ты выйдзеш за мяне замуж?» Дзяўчына ад нечаканасці не магла зразумець, што адбываецца. Калі прыйшло ўсведамленне, яна адказала станоўча. У гэты ж момант па пляцы пранесліся гучныя воплескі.

Пара родам з Мінска. Разам ужо чатыры гады. Жартуюць:



часу, каб зразумець ці падыходзяць адно аднаму, было дастаткова. А пазнаёміліся падчас вучобы ў каледжы. Дзяўчына адразу спадабалася Ягору: «Мы разам вучыліся ў каледжы сучасных тэхналогій у машынабудаванні і аўтасэрвісе «Рэспубліканскага інстытута прамысловай адукацыі». Упершыню сустрэліся на адным мерапрыемстве, і Ліза мне адразу спадабалася, — успамінае Ягор. — Спачатку проста бачыліся, а потым сталі сустракацца. Я адразу зразумеў, што сустрэў свайго чалавека: пабач з ёй сэрца б'ецца мацней. Яна добрая, шчырая, разумная, у нас шмат агульных тэм, умее падтрымліваць, я яе вельмі люблю. А што яшчэ для шчасця трэба?!»

Пасля заканчэння каледжа Ягор пайшоў працаваць на Мінскі трактарны завод, а Ліза паступіла ва ўніверсітэт на завочнае аддзяленне і таксама пайшла працаваць. Сталі разам жыць. Ягор прызнаецца, што даўно хацеў зрабіць прапанову, але абавязкова, каб гэта было арыгінальна.

### НАПЕРАДЗЕ — НАПРУЖАНАЯ БАЯВАЯ ВУЧОБА

Пасля прыняцця Ваеннай прысягі **міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН** падзякаваў ваеннаслужачым за высокую арганізаванасць. Асаблівыя словы падзякі прагучалі ў адрас маці навабранцаў. Таксама кіраўнік абароннага ведамства расказаў журналістам пра асаблівасці цяперашняга прызыву.

«Кожная прызыўная кампанія мае сваю асаблівасць, — адзначыў Віктар Хрэнін. — Гэтая прызыўная кампанія прайшла вельмі арганізавана. Мы ўнеслі некаторыя змены ў парадак прызыву. І на сёння больш за восем тысяч маладых людзей па ўсёй краіне прынеслі прысягу і папоўнілі рады Узброеных Сіл. Праблема недаўкамплектаванасці, якая існавала пэўны час ва Узброеных Сілах, вось ужо два гады як вырашана».

Міністр таксама дадаў, што сёння маладых людзей, якія гатовыя служыць у арміі, больш, чым ёсць пасад ва Узброеных Сілах. «Асаблівасць гэтай прызыўной кампаніі — у ваенкаматы паступала вельмі шмат званкоў ад маладых людзей з адным пытаннем: «Чаму мяне не бяруць у армію?» — звярнуў ён увагу. — У маладых людзей змянілася стаўленне да арміі, павысіўся яе прэстыж. Людзі сталі разумець, што абарона Радзімы — не проста словы, трэба на справе даказваць і паказваць, што мы гатовы яе абараняць».

Наперадзе хлопцаў чакае напружаная баявая вучоба. «Лёгкай службы ніхто не абяцае. Воінская служба мае на ўвазе поўнае напружанне ўсіх сіл — і маральных, і фізічных. Служыць Радзіме неабходна з поўнай аддачай», — заўважыў Віктар Хрэнін.

Па словах кіраўніка ваеннага ведамства, у працэсе баявой падрыхтоўкі маладыя людзі атрымаюць ваенна-ўліковую спецыяльнасць. «Мы значна перагледзелі праграмы баявой падрыхтоўкі і сам падыход да яе арганізацыі, — распавёў ён. — Галоўная частка падрыхтоўкі — палявыя заняткі. У аснове будзе тактыка, агнявая падрыхтоўка, інжынерная падрыхтоўка, тактычная медыцына, барацьба з дронамі і іншыя прадметы. І, вядома ж, фізічная падрыхтоўка, якая неабходна хлопцам, каб вынесці тыя нагрузкі, якія на іх будуць ускладзены».

Міністр абароны падкрэсліў, што разумее і падзяляе хваляванне бацькоў за сваіх сыноў. «Літаральна месяц таму мы ўшаноўвалі найлепшых ваеннаслужачых разам з іх бацькамі, — паведаміў генерал-лейтэнант. — Гаварылі словы падзякі і атрымлівалі падзяку ад бацькоў за тое, што іх дзеці ўзмужнелі, набылі сяброў, адчулі, што такое сапраўдная школа мужчынскага сяброўства і жыцця. Таму магу сказаць бацькам: не трэба моцна хвалявацца. Ва Узброеных Сілах у пунктах пастаяннай дыслакацыі на добрым узроўні створаны ўсе неабходныя побытавыя ўмовы, наладжана забеспячэнне формай і харчаваннем, бо ў прыярытэце нашай дзяржавы — клопат пра людзей, у арміі ў тым ліку. Але мяжы дасканаласці няма. Мы будзем рухацца далей, павялічваючы прэстыж ваеннай службы, каб нашы людзі адчувалі абарону і былі ўпэўнены, што мы захаваем мірнае неба над намі».

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**
*Барысаўскі раён.*

**26 декабря 2024 г.** **№ 11-Н/2024**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

## по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с продажей права частной собственности на земельный участок в г. Гомеле

| № лота | Наименование объекта/ адрес земельного участка: г. Гомель | Целевое назначение/ вид вещного права | Кадастровые номер, площадь земельного участка | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации, руб. | Наличие ограничений, обременений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-770 (по генплану), ул. Долгобродская, 54 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000008003135 0,0791 га | 29 735,24 | 5 649,67 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 2 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-995 (по генплану), ул. Долгобродская, 69 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000008003197 0,0892 га | 18 082,26 | 3 435,63 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 3 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-557 (по генплану), ул. Ирисовая, 18 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000008002859 0,1228 га | 24 006,95 | 4 561,32 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 4 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-776 (по генплану), ул. Кузнечная, 79 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000008003215 0,0810 га | 17 062,30 | 3 241,84 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 5 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-1017 (по генплану), ул. Кузнечная, 136 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000008003211 0,0840 га | 23 469,53 | 4 459,21 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 6 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-533 (по генплану), ул. Новаторская, 32 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000008002757 0,0810 га | 23 935,20 | 4 547,69 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 7 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-898 (по генплану), ул. Новаторская, 109 | Для строительства и обслуживания дноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000008002539 0,0836 га | 15 252,94 | 2 898,06 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 8 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-955 (по генплану), ул. Новаторская, 128 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000008002669 0,0827 га | 16 978,00 | 3 225,82 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 9 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-926 (по генплану), ул. Новаторская, 130 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000008002948 0,0811 га | 15 802,80 | 3 002,53 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 10 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-933 (по генплану), ул. Новаторская, 138 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000008003031 0,0815 га | 25 922,86 | 4 925,34 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 11 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-945 (по генплану), ул. Новаторская, 144 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000007005960 0,0777 га | 20 157,51 | 3 829,93 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 12 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-688 (по генплану), ул. Полякова И.Е., 29 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000008002478 0,0900 га | 21 390,52 | 4 064,20 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |
| 13 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-430 (по генплану), ул. Родная, 86 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000008002205 0,0840 га | 19 334,33 | 3 673,52 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр».

2. **Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов на земельном участке в г. Гомель, утвержденном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.**

3. Аукцион состоится 26 декабря 2024 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, индивидуальные предприниматели и юридические лица. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавших в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, **на р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в ЦБУ № 301 ОАО «Белагропромбанк», г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в ЦБУ № 301 ОАО «Белагропромбанк», г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах).**

**Перечень документов предоставляемых участником:**

4.1 заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; гражданам Республики Беларусь – копия паспорта, представителю гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

4.2 представители или уполномоченные должностные лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов.

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон, в процессе подготовки и проведения аукциона.

**6. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан внести:**

6.1 В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников).

6.2 После совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона местный исполнительный комитет заключает договор аренды земельного участка (в случае предоставления земельного участка в аренду).

7. Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» **с 27 ноября по 23 декабря 2024 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14. Контактные телефоны: +375 (232) 30-12-46.**

**Информация размещена на сайте: www.geodezcentr.by, gomeloblzem.by, gki.gov.by, газета «Звязда», «Гомельские ведомости»**

---

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал) информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Лидский завод электроизделий»**

**Аукцион состоится 06.12.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: - капитальное строение, инв. № 420/С-3235 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада запчастей и полуфабрикатов), общей площадью 1353,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14б; - капитальное строение, инв. № 420/С-102175 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сооружение благоустройства), общей площадью 948,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14Ж/18; - газон обыкновенный, площадью 102,5 кв. м, расположенный по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14Б. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000005000213, площадью 3,6915 га (назначение – для строительства и обслуживания производственной площадки № 2), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14Ж/6. Земельный участок является неделимым (расположены иные объекты, не подлежащие продаже). Оформление земельного участка будет осуществляться после реализации имущества |

| | |
|---|---|
| **Начальная цена продажи** | **ЛОТ № 1** – 335 672,57 руб. (триста тридцать пять тысяч шестьсот семьдесят два рубля пятьдесят семь копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | **ЛОТ № 1 –** 16 783 руб. (шестнадцать тысяч семьсот восемьдесят три рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 04.12.2024 г. до 15.00** |
| Условия проведения аукциона: возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи | |
| Извещение о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.09.2024 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |

Рэгіянальная бяспека

# НЕ ДАНІНА МОДЗЕ, А ПАТРАБАВАННЕ ЧАСУ

## Якія пытанні ўздымаліся на міжнароднай ваенна-навуковай канферэнцыі?

**У беларускай сталіцы прайшла міжнародная ваенна-навуковая канферэнцыя «Прыкладныя аспекты навуковай дзейнасці ў галіне абароны і бяспекі дзяржаў — членаў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы». Удзельнікі разгледзелі пытанні забеспячэння бяспекі дзяржаў — членаў АДКБ, развіцця відаў аператыўнага (баявога) забеспячэння ў інтарэсах войскаў (Калектыўных сіл) АДКБ, тэхнічнага абсталявання, тэхнічнага і тылавога забеспячэння Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання АДКБ. Карэспандэнт «Звязды» высветліў падрабязнасці.**

### МІСІЯ ПА ПАДТРЫМАННІ МІРУ

«Гісторыя АДКБ сведчыць аб тым, што аб'яднанне намаганняў дзяржаў-членаў і ў нашы дні дазваляе эфектыўна выконваць місію па падтрыманні міру і бяспекі на еўразійскай прасторы, адлюстроўваць унутраныя і знешнія выклікі і пагрозы калектыўнай бяспецы. У цяперашні час у непасрэднай блізкасці ад граніц дзяржаў — членаў АДКБ размяшчаюцца элементы стратэгічнай сістэмы супрацьракетнай абароны ЗША, адбываецца разгортванне дадатковых вайсковых груповак, пастаянна ўзмацняецца знешні ціск на Беларусь з боку НАТА, які рэалізоўвае агрэсіўныя памкненні калектыўнага Захаду», — было адзначана ў прывітальным слове **міністра абароны Беларусі генерал-лейтэнанта Віктара ХРЭНІНА.**

Ён таксама падкрэсліваў, што ваенна-палітычнае становішча, якое складваецца, патрабуе ўсебаковай ацэнкі стану Калектыўных сіл, аналізу і сістэматызацыі існуючых праблем у галіне абароны і забеспячэння бяспекі дзяржаў — членаў АДКБ.

«Ваенна-навуковая супольнасць актыўна падключылася да вызначэння шляхоў іх вырашэння, пра што сведчыць канферэнцыя, на якой абмеркавалі шэраг актуальных навуковых ідэй з перспектывай іх неадкладнай практычнай рэалізацыі», — дадаў кіраўнік ваеннага ведамства.

### «РАЗАМ УПЛЫВАЦЬ НА РАЗВІЦЦЁ АБСТАНОЎКІ»

Працэсы, якія адбываюцца ў свеце, паказваюць, што спектр традыцыйных рызык і выклікаў ваеннай бяспецы для дзяржаў — членаў АДКБ пашыраецца. «З улікам аналізу абстаноўкі ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне калектыўнай бяспекі, прагнозу яе развіцця мы адназначна асацыіруем бяспеку Беларусі з выбудоўваннем і падтрыманнем кааліцыйных, партнёрскіх і дружалюбных адносін з дзяржавамі, супрацоўніцтва з якімі адпавядае агульным інтарэсам», — паведаміў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Павел МУРАВЕЙКА.**

Ён дадаў, што супрацьстаяць сучасным рызыкам, выклікам і пагрозам можна толькі разам. Наяўнасць саюзнікаў і дружалюбных краін-партнёраў з'яўляецца такім жа важным фактарам забеспячэння нацыянальнай бяспекі ў ваеннай сферы, як і наяўнасць узбраення, рэсурсаў і вытворчых магутнасцяў: «У сучасным свеце паважаюць толькі моцнага. Разам мы здольныя ўплываць на развіццё абстаноўкі ў нашых рэгіёнах».

Абмеркаванне пытанняў абароны і бяспекі ў рамках АДКБ у Мінску праходзіла не ўпершыню. «Мы стварылі навукова-практычную пляцоўку, на якой, выкарыстоўваючы меркаванне экспертаў, навуковай супольнасці, ваенных практыкаў, абмяркоўваюцца і выпрацоўваюцца сучасныя падыходы процідзеяння рызыкам, выклікам і пагрозам», — адзначыў Павел Муравейка.

Начальнік Генштаба Узброеных Сіл падкрэсліў, што правядзенне падобных мерапрыемстваў — не даніна модзе, а патрабаванне часу: «Пагледзіце вакол. Сёння адкрыта выяўляецца пагаршэнне геапалітычнай абстаноўкі, нарастае стратэгічная нестабільнасць, усё ярчэй выяўляецца няздольнасць міжнародных інстытутаў уплываць на працэсы, якія адбываюцца. Ужо ні для кога не сакрэт, што супрацьстаянне па лініі Захад — Усход дасягнула гарачай фазы».



Ён таксама адзначыў, што рост напружанасці звязаны з прыняццем безадказных палітычных рашэнняў, такіх як накіраванне ўкраінскіх і міжнародных наймітаў для атакі на Курскую вобласць, выдача дазволу на прымяненне дальнабойных сістэм па аб'ектах грамадзянскай інфраструктуры ў глыбіні Расіі, прыняцце рашэння аб пастаўцы Кіеўскаму рэжыму супрацьпяхотных мін. «Мы не можам не ўлічваць дадзеныя фактары, таму што яны сур'ёзна ўплываюць на бяспеку Беларусі і на Усходне-Еўрапейскі рэгіён калектыўнай бяспекі ў цэлым», — заявіў Павел Муравейка.

Начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл дадаў, што дзяржавы Захаду актыўна перапрацоўваюць стратэгічныя канцэпцыі і дактрыны: «Сёння актыўна разгортваюцца і ствараюцца лагістычныя сістэмы, з'яўляюцца склады ўзбраення, тэхнікі, разгортваюцца кантынгенты каля нашых граніц, адкрыта мілітарызуецца эканоміка суседніх краін. Неабгрунтаванае маштабнае прымяненне ваеннай сілы на Блізкім Усходзе, парушэнне меж суверэнных дзяржаў, зневажанне нормаў міжнароднага права. Гэта ўсё адбываецца з маўклівай згоды міжнароднай грамадскасці і заходняй супольнасці. Мы сабралі прадстаўнічую канферэнцыю, каб ацаніць працэсы, якія адбываюцца ў свеце, выпрацаваць адзіныя падыходы да ацэнкі ваенна-палітычнай, стратэгічнай абстаноўкі, выпрацаваць рэкамендацыі для адпаведных ваенных ведамстваў па ўдасканаленні нацыянальных Узброеных Сіл».

Таксама Павел Муравейка пракаментаваў рашэнне прэзідэнта ЗША па пастаўцы супрацьпяхотных мін ва Украіну: «У свеце існавала сістэма стрымлівання і проціваг. Яна ўключала ў сябе забарону прымянення супрацьпяхотных мін у сучасных канфліктах. Рашэнне аб пастаўцы такіх мін ва Украіну — гэта парушэнне чарговага балансу сіл, эскалацыя сродкаў паражэння. Мы павінны гэта ўлічваць, таму што ніхто не дае гарантыі, што супраць нас таксама не будзе ўжывацца такая зброя», — падкрэсліў Павел Муравейка.

### СПЛАЎ ТЭОРЫІ І ПРАКТЫКІ

**Намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі па навуковай рабоце палкоўнік Віктар ТУМАР** адзначыў, што канферэнцыя па асвятленні і абмеркаванні пытанняў ваеннай бяспекі дзяржаў — членаў АДКБ — гэта сплаў тэорыі і практыкі: «Мерапрыемства ўжо стала традыцыйным і дапамагае саюзнікам па АДКБ абмяняцца вопытам у пытаннях забеспячэння бяспекі. Гэтая канферэнцыя з'яўляецца працягам нашай ваеннай дактрыны, у якой мы заявілі аб сваіх саюзніцкіх абавязацельствах. Мы павінны ведаць аб праблемах, механізмах, якія ўключаюць нашы партнёры, каб пераадолець іх».

Такія мерапрыемствы неабходна праводзіць для таго, каб знайсці агульныя падыходы, выпрацаваць адзіныя механізмы вырашэння гэтых праблем, даведацца меркаванні саюзнікаў на тыя падзеі, якія адбываюцца непасрэдна ў нашых рэгіёнах, дадаў палкоўнік. «Цяпер ідзе пастаянная работа па абмене вопытам. Канферэнцыя мае вельмі шырокі спектр пытанняў, пачынаючы ад непасрэдна баявога прымянення механізаваных і танкавых падраздзяленняў да медыцынскага забеспячэння. Уключаны і даклады па сродках сувязі, па выкарыстанні беспілотных лятальных апаратаў», — падсумаваў Віктар Тумар.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.**

# НОВЫ ФАРМАТ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік бібліятэкі падкрэслівае: галоўная мэта гэтай маштабнай работы — стварыць прастору дакладных ведаў аб Рэспубліцы Беларусь. У электронным фармаце энцыклапедыя дзеліцца на блокі, раздзелы. У ЦЭВ рыхтуюцца матэрыялы па тэмах «Беларусь у Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах», «Прырода Беларусі», комплексная інфармацыя аб найноўшай гісторыі краіны пад назвай «Беларусь».

— Тэксты публікуюцца на беларускай і рускай мовах, пачаты работы па перакладзе на англійскую мову, — працягнуў Станіслаў Юрэцкі. — Выданне верыфікавана. Сфарміраваны навукова-рэдакцыйны савет, навукова-рэдакцыйныя калегіі з удзелам вучоных, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, выкарыстоўваюцца вопыт і напрацоўкі беларускіх энцыклапедыстаў.

Па словах **загадчыцы Галоўнай рэдакцыі «Беларуская энцыклапедыя» Соф'і САМУЭЛЬ,** вопыт стварэння электроннай энцыклапедыі ў Беларусі першы. Была праведзена вялікая падрыхтоўчая праца, вывучана больш за дваццаць сайтаў іншых энцыклапедый.

— Пасля таго як усё прааналізавалі, у нас вымалёўваўся свой варыянт, — гаворыць загадчаца Галоўнай рэдакцыі. — Сайт складаецца з асобных тэм. Пакуль іх толькі дзесяць, але, упэўнена, гэты спіс значна пашырыцца. Больш за тое, мы думаем, што кожная тэма з часам вылучыцца ў асобны сайт і ўсё разам аб'ядналецца ў сучасны інфармацыйна насычаны партал.

Інфармацыя на рэсурсе падаецца на дзвюх мовах — рускай і беларускай. У перспектыве дадасца і англійская. Яшчэ адной адметнай рысай электроннай энцыклапедыі з'яўляецца тлумачэнне паняццяў на рускай і беларускай мовах.

Пляцоўкай для развіцця нацыянальнай мовы лічыць энцыклапедыю **дырэктар інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа НАН Беларусі Ігар КАПЫЛОЎ.**

— Электронная платформа энцыклапедыі садзейнічае развіццю навуковага стылю, насычэння яго новымі сродкамі, — гаворыць ён. — Яна адыгрывае важную ролю і ў практыцы перакладу, таму што патрабуе ад спецыялістаў не толькі прафесійных ведаў, але і шырокага кругагляду ў сферах навукі і грамадскага жыцця.

У камандзе інстытута, якая займаецца падрыхтоўкай матэрыялаў для анлайн-версіі энцыклапедыі, у асноўным моладзь — таленавітыя спецыялісты, якія дасканала валодаюць як дзвюма дзяржаўнымі, так і замежнымі мовамі. І, што немалаважна, добра ведаюць сучасныя тэхналогіі.

Адной з найважнейшых тэм у электроннай энцыклапедыі з'яўляецца гісторыя і ў прыватнасці яе раздзел «Беларусь у Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах», якім займаюцца супрацоўнікі Цэнтра ваеннай гісторыі інстытута гісторыі НАН Беларусі.

**Кіраўнік цэнтра Аляксей ЛІТВІН** лічыць, што выданне энцыклапедыі ў электоронным фармаце — факт значны, бо асноўная крыніца інфармацыі для моладзі — электронныя сродкі. Вельмі важна, каб размешчаныя на рэсурсе матэрыялы былі дакладнымі.

— Матэрыялы па Вялікай Айчыннай вайне ўключаюць шырокае кола тэм і разбіты на тры блокі. Першы блок прысвечаны адной з самых балючых тэм — генацыду беларускага народа падчас Вялікай Айчыннай вайны. Як вядома, сёння Генеральная пракуратура вядзе крымінальную справу па фактах знішчэння мірных жыхароў нашай краіны нацысцкім акупацыйным рэжымам. Па факце следства выкрываюцца новыя абставіны, якія абавязкова трэба адлюстраваць у энцыклапедыі.

Апошні раз фундаментальнае выданне ў пяці тамах «Прырода Беларусі» выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі» выпусціла 40 гадоў таму. За гэты час адбылося шмат усяго: у глабальным і рэгіянальным планах у свеце раслін і жывёл. Па словах загадчыка лабараторыі праблем экалогіі лесу і дэндрахраналогіі ДНУ «Інстытут эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі» Аляксандра Пугачэўскага, у Беларусі змяніўся клімат, у краіне ў два разы вырасла лясістасць, а сістэма асабліва ахоўных прыродных тэрыторый практычна падвоілася па плошчы і прыкладна на 30 працэнтаў — па колькасці. Уся гэта і іншая актуальная інфармацыя, па меркаванні вучонага, павінна быць адлюстравана ў электронным выданні.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

# СВЯТА




## «МАЁ ЖЫЦЦЁ. МОЙ ШЛЯХ. МОЙ ПРЭЗІДЭНТ»

Праект пад такой назвай стартаваў у МДУ імя А. Куляшова. Дзве гадзіны працягвалася сустрэча студэнтаў і прадстаўнікоў грамадскасці з **доктарам педагагічных навук, прафесарам, заслужаным дзеячам навукі Рэспублікі Беларусь Аляксандрам РАДЗЬКОВЫМ.** Прафесар, які ў пачатку нулявых некалькі гадоў узначальваў ВНУ, валодае дарам трымаць увагу аўдыторыі, у тым ліку маладзёжнай. Шчырасць, вобразнасць мыслення, цікавы погляд на падзеі, вялікі вопыт, у тым ліку работы ў вышэйшых эшалонах улады — усё гэта падкупляе.

Мадэратар сустрэчы, **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, старшыня праўлення грамадскай арганізацыі «Беларускае таварыства «Веды» Вадзім ГІГІН** адзначыў, што мэта праекта, першым удзельнікам якога стаў Аляксандр Радзькоў, — праз яркіх асоб паказаць кіраўніцтва дзяржавы. Аляксандр Міхайлавіч дзяліўся ўспамінамі, расказваў пра сучаснасць і пра тое, як будавалася беларуская дзяржаўнасць. Ён перакананы, што ўсё ў нашым жыцці заканамерна.

— Прырода разумная: для кожнага з нас малюе перспектыву, — разважаў ён. — І не столькі вызначае, колькі закладвае гэтую перспектыву. Камусьці дае здольнасці творчыя, мастацкія, камусьці — літаратурныя, інжынерныя, матэматычныя, а камусьці — лідарскія. І важна, каб чалавек сам зразумеў, для чаго ён прызначаны ў жыцці. Зразумеў гэта і потым рэалізаваў. Для кіраўніка краіны першапачаткова павінна быць прыроджаная якасць лідарства. Калі прыводзіш прыклад такіх людзей, як наш Прэзідэнт, або яго настаўнікаў, гэта якраз доказ, як трэба жыць, сябе развіваць, дасягаць вышынь.

У выступоўцы спыталіся пра галоўныя дасягненні эпохі Аляксандра Лукашэнкі. Ён адказаў, што, па-першае, гэта наша краіна. «Мы з вамі пад кіраўніцтвам Прэзідэнта стварылі краіну такой, якая яна ёсць», — аргументаваў ён. На другое месца Аляксандр Радзькоў паставіў Саюзную дзяржаву, тое, што Беларусь разам з Расіяй змаглі выбудаваць сяброўскія адносіны. І працягваюць паказваць іншым, як можна ствараць раўнапраўныя адносіны, забяспечваць бяспеку адно аднаго. «Гэтыя дасягненні — самыя галоўная багацці для кожнага беларуса, і іх можна і трэба захаваць», — падкрэсліў беларускі палітык.

## «ЭФЕКТ КУЛЯШОВА»

Тэма мерапрыемства «Знакавая сустрэча» — «Хто і як уплывае на наша мысленне», як, дарэчы, і месца яе правядзення — фудкорт гандлёвага цэнтра «Атрыум», — былі нечаканыя. Гледачы размясціліся за столікамі, сумяшчаючы сняданак з размовай. Удзел у сустрэчы ўзялі генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, вядомы палітычны аглядальнік Вадзім Гігін і **беларускі тэлевядучы Рыгор АЗАРОНАК.** Рыгор адразу ж прызнаўся, што на фудкорце яму яшчэ выступаць не даводзілася.

— Гаворачы пра паліттэхналогіі, ці можна казаць, што фастфуд — гэта нейкі кірунак, які фарміруе наша мысленне? — з гэтага правакацыйнага пытання пачаў размову мадэратар мерапрыемства, аглядальнік «Альфа Радыё» Вадзім Шэпет.

На думку Вадзіма Гігіна, аднолькавыя брэнды ва ўсім свеце — гэта прыкметы глабалізацыі — свайго роду ўніфікацыя, выстройванне ўсіх пад адзін грэбень.

— За ежай заўсёды ідуць тавары, за таварамі — палітыка, а за палітыкай ідуць салдаты, — аргументаваў ён.

Рыгор Азаронак заўважыў, што мы ёсць тое, што нас акаляе, а таксама тое, што мы ядзім, глядзім. «У канцы 1980-х у Маскве адкрыўся першы «Макдональдс», а хутка распаўся СССР, — супаставіў ён факты. — Як казаў Міхаіл Булгакаў, разруха пачынаецца ў галовах. «Макдональдс» быў на той час як нейкае прычасце да амерыканскіх каштоўнасцяў. І для нас, малых яшчэ школьнікаў, паход у «Макдональдс» быў як заахвочванне.




З калегі пакпіў Вадзім Гігін: «Рыгор Юр'евіч «Макдональдс» цяпер не прызнае, ён перайшоў на шаурму — еўразійскія каштоўнасці».

Ад ежы паступова размова перайшла да паліттэхналогій, з якімі беларусы сутыкнуліся ў 2020 годзе.

— Як любыя брэнды, не толькі ежы, і фільмы, і адзенне, роўна таксама і палітыкі дзейнічаюць па адной метадычцы, — перакананы Вадзім Гігін. — Дастаткова ўспомніць, як жанчыны стаяць на каленях перад паліцэйскімі. Можна браць Мінск, Кіеў, Грузію. Я быў у М'янме, краіна ў Малой Азіі, там таксама жанчыны стаялі на каленях перад паліцэйскімі. Не можа быць паўсюль спантанна. Гэта такі палітычны фастфуд, тое, што, як лічыцца, павінна працаваць паўсюль. Супадзення не бывае.

— Паліттэхналогій шмат, — працягваў разважаць Азаронак. — Напрыклад, кіраванне марай. Мы, маўляў, еўрапейцы. Не такія, як усе. Як фарміруецца мысленне? У нас, напрыклад, усё найлепшае асацыіруецца з еўра — еўрарамонт, еўравокны, усё з дадатковым коранем «еўра» добрае. А калі пачынаеш параўноўваць паасобку і дасканала, атрымліваецца, што ў нас лепш. Інфапсіхоз, інфапандэмія — так пра заходнія паліттэхналогіі кажа наш Прэзідэнт.

Як працуюць гэтыя тэхналогіі, Рыгор Азаронак прадэманстраваў на эфекце ў кінамантажы, які мае назву «эфект Куляшова». На экране побач з фотаздымкам артыста Сяргея Бязрукава з'явіліся па чарзе — жанчына, ежа, статуэтка Оскара. Прысутным прапанавалі выказаць здагадку, пра што ў кожным выпадку думае Бязрукаў. Атрымалася забаўна.

— Калі мы супастаўляем розныя кадры, складваецца ўражанне, што адзін і той жа чалавек думае пра рознае, у залежнасці ад таго, што знаходзіцца ў кадры побач з ім, — падсумаваў палітычны аглядальнік. — Насамрэч, наш герой можа думаць зусім пра іншае. Але пры мантажы адразу ж закладваецца вобраз. У гэтым сутнасць «эфекту Куляшова». Эфект шырока выкарыстоўваецца ў палітыцы. Дастаткова накласці голас палітыка на кадры, якія выклікаюць страх, агіду, і ён будзе з гэтым суадносіцца. Наша задача — навучыцца ў гэтым разбірацца, бо адна справа — кіно, другая — бізнес або палітыка. Вам спрабуюць прадаць тавар, выкарыстоўваючы тую ж маніпуляцыю свядомасцю, каб адключылася крытычнае ўспрыманне сучаснасці.

Тэма размовы захапіла ўсіх, прагучала шмат пытанняў. Гледачоў цікавіла, што думаюць палітолагі пра тыя складаныя абставіны, якія сёння пануюць у свеце, і ці дойдзе справа да самага страшнага. Пыталіся пра сацсеткі, як яны ўплываюць на ўспрыманне інфармацыі і якія платформы найбольш папулярныя ў Беларусі.

— Калі рэгіструецеся ў любой сацыяльнай сетцы, пакідаеце ўсе даныя для вялікіх сервераў, якія знаходзяцца не ў нас. І любы ваш рух пакідае лічбавы крок, — папярэдзіў Рыгор Азаронак. — Фактычна вы расказваеце не толькі пра тое, з кім перапісваецеся, але і тое, што глядзіце, чым захапляецеся. Трэба быць асцярожнымі.




Магіляўчане цікавіліся, якая адукацыя лепшая: класічная або інавацыйная, як замяніць кока-колу айчыннымі напоямі, як захаваць сваё інфармацыйнае поле, абараніць дзяцей ад заходняй ідэалогіі.

— Трэба захаваць унутраны мір, і Прэзідэнт даў рэцэпт, — нагадаў Вадзім Гігін. — Працуйце спакойна, рабіце тое, што прывыклі рабіць заўсёды, дабівайцеся вынікаў, астатняе — яго задача. Калі кожны будзе займацца сваёй справай, мы захаваем унутраны мір і перададзім гэту атмасферу вакол нас.

17-гадовы Арцём Акуловіч, першакурснік гістфака МДУ імя А. Куляшова, прызнаўся, што сустрэча была для яго вельмі цікавая і пазнавальная.

— Жывыя сустрэчы шмат чаго даюць, — падзяліўся ён. — Карысна ведаць, якія могуць быць пасткі, як правяраць крыніцы інфармацыі. У інтэрнэце хапае такіх, хто маніпулюе нашай свядомасцю.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ




## «ВЕДЫ БЕЗ МЕЖ»

Гэта яшчэ адна акцыя, якая стартавала на «Марафоне адзінства» ў Магілёве, звязана з бібліятэчнай справай. Яе ініцыятарам выступіў генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім Гігін. Як ён патлумачыў, ідэя нарадзілася падчас абмеркавання пытання папулярызацыі сацыяльна значнай літаратуры з прадстаўнікамі Міністэрства культуры і Міністэрства інфармацыі. У спіс трапілі 50 найменняў кніг аб гісторыі, культуры, палітыцы Беларусі. Акрамя гэтага, вырашана ўсе раённыя бібліятэкі падключыць да электронных рэсурсаў Нацыянальнай бібліятэкі.

На сустрэчы з прадстаўнікамі Магілёўскага аблвыканкама, Міністэрства культуры, кіраўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі прысутнічалі кіраўнікі раённых і гарадскіх бібліятэк.

— Мерапрыемства вельмі важнае для нашай установы, — падкрэсліла **дырэктар Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. Леніна Ілона САРОКІНА.** — Кнігі дапамогуць нам больш глыбока вывучаць гісторыю нашай краіны, абапіраючыся на дакладныя факты. Галоўнае, што нашы раённыя бібліятэкі і цэнтральныя гарадскія Магілёва і Бабруйска атрымалі доступ да электроннай базы Нацыянальнай бібліятэкі, якая валодае наймагутнейшым патэнцыялам алічбаваных выданняў. Яны захоўваюцца ў Беларусі ў асноўным у адзіным экзэмпляры і да іх не тое што радавы чытач — нават бібліятэкары не мелі раней доступу. Цяпер любы ахвотны, які хоча вывучаць сваю гісторыю і імкнецца да гэтага, можа скарыстацца ў раённай бібліятэцы анлайн-рэсурсам. «Марафон адзінства» — цудоўная акцыя. Нават у арганізацыі мерапрыемствы мы падстаўляем адно аднаму плячо і працуем разам.




Вадзім Гігін паведаміў, што акцыя «Веды без межаў» — гэта першы крок у стварэнні інтэграванай нацыянальнай электроннай бібліятэкі.

— Маладому чалавеку сарыентавацца ў гэтым моры інфармацыі аднаму цяжка. І кніги з'яўляюцца пуцяводнымі зоркамі, — патлумачыў ён. — Мы падказваем чытачу, дзе браць правільную літаратуру. А такія пытанні паступаюць падчас сустрэч рэгулярна. Я не сумняваюся, што друкаваная кніга будзе жыць заўсёды, але электронны рэсурс — гэта наогул сімвал адзінства. Паступова ўсе вобласці і раёны будуць падключаны да электронных рэсурсаў Нацыянальнай бібліятэкі. Гэта базы даных, бібліяграфічныя спісы, магчымасць праверыць інфармацыю. Мы тэхналагічна гатовы да гэтага. Карыстальнік атрымае веды ў выглядзе друкаванай кнігі, алічбаваных даных, неабмежаванага доступу да верыфіцыраванай, праверанай інфармацыі.

**Дырэктар Цэнтральнай раённай бібліятэкі Бабруйскага раёна Жанна КАНЬКОВА** паведаміла, што ў іх на абслугоўванні 51 вёска, болей як тысяча дзвесце чытачоў, і шмат хто з іх цікавіцца гісторыяй. Новыя магчымасці — толькі на карысць.

— Цудоўна, што «Марафон адзінства» прырастае новымі пляцоўкамі, — адзначыла ў сваёй прамове **кіраўнік упраўлення культуры і народнага мастацтва Міністэрства культуры Ірына КАРПОВІЧ.** — Бібліятэкары — тыя людзі, якія стаяць на вастрыі нашай інфармацыйнай, літаратурнай дзейнасці. Значнасць бібліятэкара вельмі важная. Ён заканадаўца моды ў літаратуры. Невыпадкова мы шмат увагі ўдзяляем сацыяльна значнай літаратуры. Гэта тая, якую на сваім узроўні міністэрства, бібліятэкі, усе, хто ўваходзіць у вялікі каардынацыйны савет, ужо першапачаткова адсочваюць і рэкамендуюць даносіць да насельніцтва на культурным і ідэалагічным узроўні. Гэта такі маркетынгавы ход. У крамах купляюць тое, што на адлегласці выцягнутай рукі. І ў бібліятэчнай справе трэба так дзейнічаць.

## АДНУ СПРАВУ РОБІМ РАЗАМ

Гэты праект таксама першую абкатку прайшоў у Магілёве. Ён сабраў у адным з цэхаў ААТ «Ольса» работнікаў прадпрыемства і ўнітарнага прадпрыемства «Тыфлас» Беларускай асацыяцыі інвалідаў па зроку. «Тыфлас» — асноўны пастаўшчык кабельнай прадукцыі кабельных шнуроў для электрапомп «Ручаёк» , якія выпускае «Ольса». Такі вось паказальны прыклад кааперацыі на карысць двух вытворцаў.

— У агульным аб'ёме прадукцыі дадзены від займае 20 %, — паведаміла дырэктар **ААТ «Ольса» Кацярына БАГДАНОВІЧ.** — Прадукцыя з'яўляецца імпартазамяшчальнай, і аналагічных вытворчасцяў у Беларусі няма. На наступны год ёсць планы супрацоўніцтва з гэтым прадпрыемствам і па новых відах прадукцыі.

Кіраўніца адзначыла, што сустрэча ў рамках «Марафону адзінства» напоўнена радасцю і пазітывам. Такі матыў у рабоце натхняе на далейшую стваральную працу. Адну справу «Ольса» і «Тыфлас» робяць з 2013 года, але актыўна партнёрства стала развівацца з 2022 года, калі «Тыфлас» стаў пастаўшчыком металаёмістай прадукцыі. На 20 лістапада 2024 года імі пастаўлена болей чым 260 тысяч найменняў вырабаў.

Дырэктар прадпрыемства «Тыфлас» Аляксандр Бажкоў таксама згодны з тым, што супрацоўніцтва атрымалася вельмі эфектыўнае, як, дарэчы, і мерапрыемства.

— Праект «Адну справу робім» добры тым, што людзі пазнаёмяцца паміж сабой і гэта дасць новы штуршок для далейшага супрацоўніцтва, — заўважыў ён. — Вельмі добры фармат, трэба яго працягваць. На сустрэчу прыйшлі нашы рабочыя, майстры, ІТР, тыя, хто не задзейнічаны на дадзены момант у працоўным працэсе.

Для ўдзельнікаў сустрэчы была арганізавана невялікая прэзентацыя прадукцыі ААТ «Ольса» з удзелам выхаванцаў дзіцячага садка, цырымонія ўзнагароджвання і невялікі канцэрт у цэху. Настрой падымалі салісты квартэта «Добрыя людзі».

## АДЗІНЫЯ — НЕПЕРАМОЖНЫЯ

У горадзе за два дні адбылося шмат падзей. Гэта і традыцыйныя «НЯсумныя НЯлекцыі», цэхавыя канцэрты «Разам працуем, разам спяваем», квэст на веданне Беларусі і роднага краю «Гэта ўсё маё роднае», адкрыццё мурала «Будучыня Беларусі ў тваіх руках» на адным са шматпавярхоўвікаў па вуліцы Фаціна, выставы і вялікі кірмаш каля Лядовага палаца пад назвай «Са знакам якасці».

— Наш «Марафон адзінства» з кожным разам папаўняецца новымі праектамі, — адзначыў у размове з журналістамі Вадзім Гігін. — Калі мы ўспомнім, як ён пачынаўся ў Маладзечне, то на Магілёўшчыне разы ў тры павялічылася колькасць акцый. З новых гэта «Адну справу робім», «Кнігі ў дар», пашырылася колькасць выстаў, з'явіўся новы праект «Маё жыццё. Мой шлях. Мой Прэзідэнт» і «Веды без межаў». Марафон ахоплівае ўсё больш людзей і працягвае развівацца.

Выніковым акордам стаў гала-канцэрт «Час выбраў нас». Сярод тых, хто выступаў на сцэне, быў і даўнейшы сябар газеты «Звязда» народны ансамбль «Вязанка» Вяззеўскага сельскага Дома культуры, заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь.

— Мы рады ўдзельнічаць у гэтым праекце, бо нічога няма даражэйшага, чым сваё, глыбіннае, сапраўднае, дарагое, — запэўніла **кіраўнік народнага ансамбля Ірына ЗАБАЎСКАЯ.** — І тое, што нас запрашаюць на такія маштабныя мерапрыемствы, нагода паэнаёміць людзей з нашай творчасцю, паглядзець, што робяць іншыя, і аб'яднацца.

Тэма адзінства чырвонай ніткай прайшла праз гала-канцэрт.

— Моц Прыдняпроўскага краю, сіла каранёў, ад якіх Прэзідэнт ніколі не адрываецца, даюць яму магчымасць эфектыўна кіраваць нашай краінай, застаючыся народным Прэзідэнтам, — звярнуўся да гледачоў гала-канцэрта **Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Дзмітрый КРУТОЙ.**

**Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** заклікаў душой і сэрцам любіць сваю краіну.

— Мы 30 гадоў жывём у суверэннай краіне, 30 гадоў разам з нашым Прэзідэнтам будуем Рэспубліку Беларусь. Мы любім яе і душой, і сэрцам. Таму што яна прыгожая, таму што яна наша.

Песню «Час выбраў нас» трохтысячная зала Лядовага палаца спявала разам. Рэспубліканская акцыя «Марафон адзінства» адправілася далей. У найбліжэйшую пятніцу і суботу яе сустрэне Віцебская вобласць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**



## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «ЗападХимСервис»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1424 | Автомобиль Skoda Rapid (рег. знак 4873 НА-4), кузов (рама) XW8AT4NH2MK122973, 2021 г. вып. | 58320,00 | 5832,00 | 2916,00 |
| 1425 | Автомобиль Skoda Rapid (рег. знак 4915 НА-4), кузов (рама) XW8AT4NH6MK123222, 2021 г. вып. | 54324,00 | 5432,40 | 2716,20 |

В отношении лотов проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 206 (30340) от 22.10.2024 г., стр. 11

В отношении лотов имеется временное ограничение на снятие транспортных средств с учета. Подробнее по тел. +375 (29) 3650697 (Екатерина)

**Местонахождение:** г. Минск

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **10 декабря 2024 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | с 10.00 26 ноября 2024 года до 16.00 6 декабря 2024 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «ЗападХимСервис», проводимых 10.12.2024 г.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375 (29) 3082897, +375 (29) 3058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 6 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 7 (семи) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте: https://orgtorg.by/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375293042560 (Андрей).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 г. № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «ЗападХимСервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375293650697 – Екатерина. (231335, Гродненская область, Ивьевский район, с/с Липнишковский, аг. Липнишки, ул. Виленская, д. 12А, корпус 1, комн. 3, УНП 590191328)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, ☎ тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (Организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (Продавец) извещает о проведении 27 декабря 2024 года открытого аукциона по продаже имущества на праве хозяйственного ведения в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2-9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи без учета НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условия** предоставления рассрочки платежа: первоначальный платеж – 50 % от цены продажи Лота с учетом ранее внесенной суммы задатка; срок оплаты первоначального платежа - не позднее 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. В случае приобретения имущества в рассрочку, оплата стоимости приобретенного имущества предоставляется в соответствии с законодательством. Реализованное на аукционе имущество находится у Продавца (РУП «Белпочта») до окончательного расчета Победителя аукциона по договору купли-продажи | | | |
| 1 | **Автомобиль** грузовой специальный фургон изотермический **MAZ-5336 A3-340 KUPAVA 573100,** регистрационный знак AI 9077-3, инв. по бух. учету № 504010038, VIN Y3H573100D0065076 Y3M5336A3D0001685, пробег 385 729 км, находящийся по адресу: г. Гомель, пр-т Речицкий, 9а. Ранее данный автомобиль использовался на почтовых маршрутах. Внешнее состояние удовлетворительное. Местное коррозийное разрушение кабины, дверей. Требуется капитальный ремонт передней подвески: замена шкворней, тяг. Без ГТО | 26 400,00 | 2 640,00 |
| 2 | **Автомобиль** грузопассажирский фургон **UAZ 390995-330**, регистрационный знак AI2918-3, инв. по бух. учету № 504000024, VIN 390900B0201769 XTT390995B0420218, пробег 523 000 км, находящийся по адресу: Гомельская обл., Мозырский район, г. Лельчицы, ул. Советская, 23. Ранее данный автомобиль использовался на почтовых маршрутах. Внешнее состояние неудовлетворительное. Коррозийное разрушение кузова, крыльев, дверей. Двигатель имеет предельный износ (низкая компрессия и давление масла). Задний и передний мосты имеют предельный износ главной пары и подшипников, ведомой и ведущей шестерни. ГТО до 04.05.2025 г. | 4 061,78 | 406,18 |
| 3 | **Автомобиль** грузовой фургон «**Рено Кенгу»,** регистрационный знак АВ 3019-3, инв. по бух. учету № 504260012, VIN VF1FC0JCF38703916, пробег 384 000 км, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Первомайская, 76. Ранее данный автомобиль использовался на почтовых маршрутах. Внешнее состояние неудовлетворительное. Двигатель имеет предельный износ (низкая компрессия и давление масла, повышенный расход масла). Коробка перемены передач имеет предельный износ деталей: износ валов, шестерен и подшипников, люфт подшипников в корпусе. Требуется капитальный ремонт или замена. ГТО до 11.07.2025 г. | 4 249,78 | 424,98 |
| 4 | **Прицеп тракторный ПСЕ-Ф-12,5Б,** регистрационный знак ГЮ 2531 без технического паспорта, инв. по бух. учету № 504100001д, номер кузова не установлен, находящийся по адресу: г. Гомель, проспект Речицкий, 9а. Ранее использовался для хозяйственных нужд предприятия. Внешнее состояние неудовлетворительное. Днище, борта коррозированы, колеса имеют микротрещины. Без ГТО | 982,09 | 98,21 |

**Продавец:** Гомельский филиал РУП «Белпочта», 246048, г. Гомель-48, ул. Советская, 8.

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел.: **8 (0232) 29-38-97 Щеглов Сергей Николаевич.**

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»):** р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 26 ноября 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Формы заявления и соглашения можно предварительно запросить у Организатора аукциона по электронной почте expert-usluga.by@mail.ru.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 26 декабря 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три календарных дня до его проведения. Победитель аукциона, либо единственный участник, согласный приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на **5** % (далее – Претендент на покупку) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня проведения аукциона (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего возмещение Организатору аукциона стоимости затрат на организацию и проведение аукциона), оплатить стоимость приобретенного имущества в течение **5 (пяти) календарных дней** с даты заключения договора купли-продажи, за исключением оплаты стоимости приобретенного имущества в рассрочку.

